# УПЛЫЎ УНУТРЫПАЛІТЫЧНАЙ СІТУАЦЫІ Ў ДЗЯРЖАВЕ НА ЗНЕШНЮЮ ПАЛІТЫКУ ВКЛ У КАНЦЫ XV – СЯРЭДЗІНЕ XVI СТ.

**МІКАЛАЕВА Л.В.**

КАНДЫДАТ ГІСТАРЫЧНЫХ НАВУК, ДАЦЭНТ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІНФАРМАТЫКІ
І РАДЫЁЭЛЕКТРОНІКІ
Г. МІНСК, БЕЛАРУСЬ

Знешняя палітыка ВКЛ пераламляла і адлюстроўвала ў пастаноўцы сваіх мэтаў, выбары сродкаў і метадаў унутрыпалітычную сітуацыю ў дзяржаве; абапіралася на эканамічныя рэсурсы, што меліся ў ёй, на яе кадравы патэнцыял. Таму пералічаныя фактары мелі немалаважнае значэнне для выніковага правядзення знешнепалітычных акцый. А ў поліэтнічнай і поліканфесійнай дзержаве, якой было ВКЛ, дзе фактычнае кіраванне належала магнацкай алігархіі, патрабаванне падтрымліваць пералічаныя фактары ў належным стане набывала асаблівае гучанне. Як паказала практыка, нават простая варожасць паміж вядучымі магнацкімі родамі магла прывесці да непрадказальных наступстваў.

Прыкладам можа служыць спрэчка паміж князем М. Глінскім і панам Я. Забярэзінскім. Канфлікт, які браў пачатак яшчэ ў 1503 г. [8, арк. 459–461] і прычыны якога таксама не зусім ясныя, не быў своечасова вырашаны вялікім князем літоўскім. Ва ўмовах распачаўшайся вайны Вялікага Княства Маскоўскага з ВКЛ 1507 – 1508 гг. сітуацыяй скарыстаўся вялікі князь маскоўскі Васіль III, які прапанаваў пакрыўджанаму боку (князю М. Глінскаму) сваю падтрымку і абарону [3, с.70]. Вынікам стаў успыхнуўшы ў пачатку 1508 г. мяцеж [16, p. 74–82; 3, с. 71], які выліўся ў рэйд атрадаў князя М. Глінскага па цэнтральных і паўнёвых землях сучаснай Беларусі [2, с. 239–241], што яшчэ больш дэстабілізавала становішча. У тыле ліцвінскага войска фактычна адкрыўся другі фронт. На справе Васіль III з дапамогай князя М. Глінскага дабіўся таго, чаго не мог дабіцца яго бацька Іван III ад крымскага хана Менглі-Гірэя [12, с. 317]. Маршрут атрадаў М. Глінскага пралягаў амаль па тых жа мясцовасцях, куды скіроўваў у свой час Іван III татарскія загоны: Тураў, Мазыр, Слуцк, Наваградак, Менск. Тым самым адцягвалася ўвага і частка сіл ВКЛ ад усходняга фланга барацьбы. Не выключана, што складаная абстаноўка ўнутры краіны магла быць адной з прычын, якая падштурхнула кіраўніцтва ВКЛ да заключэння ў 1508 г. “вечнага” міру з Масквой, які замацаваў за апошняй вялікія тэрыторыі, захопленыя падчас папярэдніх войнаў, а вяртанне ліцвінскімі войскамі Любеча кардынальна сітуацыю не мяняла [1, с. 53–56; 4, с. 125–128].

Такія прыклады, праўда, з некалькі меншым рэзанансам, можна прыводзіць яшчэ. Паны Рады, якім у адсутнасць вялікага князя належала фактычная ўлада ў краіне [6, с. 86], варагавалі паміж сабою [10, арк. 226–242; 9, арк. 829]. Яны нават не заўсёды маглі сабрацца ў адным месцы для прыняцця рашэнняў, ці ўвогуле не з’яўляліся ў такія месцы збору [5, с. 78].

Библиотека БГУИР

Прыкладам можа служыць выпадак, апісаны ў 1521 г. у лісце троцкага ваяводы А.М. Гаштольда да караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Старога: "… ваша м(и)л(о)сть рачилъ былъ всим паном съем положити о середопостьи у Вилъни, на который часъ и на местце пре(-) вашу м(и)л(о)сть менованe, панъ мои (г.зн. пан А. Гаштольд, – Л. М.) яко завжды послушныи ваш(е)и м(и)л(о)сти в часъ приехалъ, где ж и панъ староста жомоитскии (г. зн. пан С.Я. Кезгайла, – Л. М.) приехалъ, и там будучи, досыт долго ждали пана воеводы виленъског(о) (г. зн. пана М.М. Радзівіла, – Л. М.), которыи, коли бъ былъ ваш(е)и м(и)л(о)сти послушонъ, мелъ бы прьвеи, нижли хто на свое местце приехати. Але хто со ни на листы, а ни на посълы, а ни на росказане ваш(е)и м(и)л(о)сти хотелъ вчинити, а о всем о том напротивъку росказанью ваш(е)и м(и)л(о)сти противъне а пышне вчинилъ собе на онъ часъ другии съем в Ганези съ своими помоцъники…" [10, арк. 231]. У выніку важнейшыя пытанні жыцця дзяржавы не маглі быць вырашаны. Як паказала практыка, Рада не магла ў пэўныя перыяды добра функцыянаваць падчас доўгай адсутнасці гаспадара ў дзяржаве. Аднак пакуль існавала асабістая ўнія з Польшчай такія ад'езды гаспадара за мяжу былі з'явай непазбежнай. Як лічуць некаторыя даследчыкі, за гэтым і крылася адна з важнейшых прычын апазіцыі Рады паноў ВКЛ да ўніі з заходнім суседам [14, p. 44–45]. Такім чынам, адной з умоў стабілізацыі ўнутрыпалітычнага становішча ў дзяржаве была сталая прысутнасць вялікага князя. Як вынік, амаль пастаяннай просьбай у перапісцы паміж панамі Рады і вялікім князем стаў заклік да гаспадара прыехаць у ВКЛ [9, арк. 211, 826–829].

Апошняя акалічнасць мела вялікае значэнне для ваеннай часткі знешняй палітыкі дзяржавы, якая ахоплівала дзейнасць па выкарыстанню сілавых сродкаў палітыкі ў міждзяржаўных адносінах. Але для таго, каб іх выкарыстаць, трэба было спачатку гэтыя сродкі стварыць. Натуральна, ВКЛ клапацілася пра забеспячэнне сваёй ваенна-палітычнай магутнасці, без якой само яго існаванне залежала б ад выпадку і падвяргалася б небяспецы гвалтоўнага ўздзеяння з боку тых ці іншых знешніх ці ўнутраных дэструктыўных сіл. Пры гэтым асобае месца ў структуры ваенна-палітычнай магутнасці займаў уласна ваенны патэнцыял, без якога немагчымыя былі як падрыхтоўка і вядзенне войнаў, так і іх папераджэнне. Ваенны патэнцыял заключаўся ў магчымасці дзяржавы ўтрымліваць і ўдасканальваць узброеныя сілы, павышаць іх баяздольнасць, папаўняць прафесійнымі кадрамі, аснашчаць адпаведнай зброяй і харчаваннем. У сваю чаргу ён быў звязаны з палітычным, эканамічным, сацыяльным, духоўным, дэмаграфічным, геаграфічным фактарамі. Аднак праблема заключалася ў тым, што ваенны патэнцыял патрабаваў для свайго ўвасаблення і спецыяльнай ваеннай арганізацыі. А менавіта яе ў ВКЛ і не было, паколькі не было сталага войска. Трэба адзначыць, што ў разглядаемы перыяд пастаянных армій у еўрапейскіх краінах таксама не было. Таму пад паняццем "сталае войска" мы маем на ўвазе баяздольныя вайсковыя фарміраванні, якія б прысутнічалі на службе больш-менш працяглы тэрмін і не распускаліся падчас ваенных дзеянняў.

Бібліятэка БДУІР

Прэцэдэнт на той час быў створаны ў Венгрыі ў час праўлення Мацвея Корвіна[1458 – 1490], калі для супрацьдзеяння туркам у краіне ўтрымліваліся атрады наёмнікаў, якія да пачатку 1490-х гг. дзейнічалі пастаянна. Асновай жа ўзброеных сіл ВКЛ у разглядаемы перыяд заставалася шляхецкае апалчэнне – паспалітае рушанне, па колькасці недастатковае для таго, каб мець магчымасць супрацьстаяць агрэсіўным захадам суседзяў [13, с. 6], складаючы прыкладна 20 тысяч ратнікаў [11, арк. 8–290; 7, с. 168], пры агульнай колькасці насельніцтва каля 2,5 міліёны чалавек [15, p. 210]. Такім чынам, атрымліваецца, што патэнцыяльная колькасць паспалітага рушання не складала і 1% ад агульнай колькасці насельніцтва – паказчык надзвычай нізкі.

Адносна другой часткі ваенных сіл ВКЛ, якую складала наёмнае войска, прамых звестак за ўвесь разглядаемы адрэзак часу няма. Можна толькі з упэўненасцю сцвярджаць, што ў розныя перыяды яно, у залежнасці ад стану скарбу дзяржавы, складала розную колькасць, якая магла змяняцца нават на працягу аднаго года. Такая з’ява была абумоўлена адсутнасцю спецыяльнага фонду дзяржаўных прыбыткаў, прызначанага для ўтрымання прафесійнага наёмнага войска [13, с. 60]. Тым самым можна сцвярджаць, што ВКЛ у разглядаемы перыяд не валодала неабходным эканамічным патэнцыялам для забеспячэння існавання сталага прафесійнага войска як інстытута і апоры вярхоўнай улады. У сваю чаргу азначаная акалічнасць рабіла вялікага князя залежным ад рашэнняў Рады паноў, а пазней і шляхты.

Такім чынам, улады ВКЛ прадпрымалі пэўныя меры для забеспячэння спрыяльнага для паспяховай знешнепалітычнай дзейнасці ўнутрыпалітычнага становішча. Аднак забяспечыць неабходны для гэтага эканамічны і ваенны патэнцыял яны не маглі. Таму ўсе мерапрыемствы ў гэтай галіне належыць прызнаць палавінчатымі і недастатковымі для павелічэння абароназдольнасці дзяржавы.

Літаратура


1. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею: В 5 т. – СПб.: Тип. II отделения собств. Е. И. В. канцелярии, 1848. – Т. 2: 1506–1544. – III, 405, [ 39 ] с.
2. Греков, И.Б. Очерки по истории международных отношений Восточной Европы XIV – XVI вв./ И.Б. Греков. – М.: Изд-во Восточной литературы, 1963. – 374 с.
3. Зимин, А.А. Новое известие о восстании Михаила Глинского в 1508 году/ А.А. Зимин // Советские архивы. – 1970. – №5. – С.68–73.
4. Литовская метрика = Lietuvos metrica / Ин-т истории Литвы. – Вильнюс: Mokslo ir ehcikloediju leidykla, 1995. – Кн. 8: Книга записей (1499–1514) / [Подгот. А. Балюлис и др.]. – 708 с.
5. Максимейко, Н.А. Сеймы Литовско-Русского государства до Люблинской унии 1569 г. / Н.А. Максимейко. – Харьков: Тип. А. Дарре, 1902. – II, 164 с., IV, 205 с.
6. Малиновский, И.А. Рада Великого Княжества Литовского в связи с Боярской думой древней России/ И.А. Малиновский. – Томск:

Библиотека БГУИР

Типолитография Сибирск. Т-ва Печатн. Дела, 1912. – Ч. 2, вып. 2: Рада Великого Княжества Литовского (1492-1569). – 492, XVIII, XXXV с.

7. Менжинский, В.С. Структура феодального землевладения в Великом княжестве Литовском (По материалам Переписи войска 1528 г.)/ В.С. Менжинский // История СССР. – 1987. – №3. – С. 164–178.

8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). КМФ-18. Воп. 1. Спр. 6.

9. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 7.

10. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 223.

11. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 523.

12. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Крымскою и Ногайскою ордами и Турцией. – Т. 1: 1474–1505. Эпоха монголо-татрского ига / Под ред. Г.Ф. Карпова // Сборник Императорского Русского Исторического Общества. – СПб.: Тип-я Ф. Елеонского, 1884. – Т. 41. – XXII, 558 с.

13. Сагановіч, Г.М. Войска Вялікага Княства Літоўскага ў XVI – XVII стст. Г.М. Сaганович/ Пад рэд. Г. В. Штыхава. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 79 с.

14. Bardach, J. Krewo i Lublin. Z probliemów Unii polsko-litewskiej/ J. Bardach//Bardach, J. Studia z ustroju i prawa Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV – XVI wieku/ J. Bardach. – Warszawa: PWN, 1970. – P. 11–67.

15. Łowmiański, H. Zaludnienie państwa Litewskiego w wieku XVI. Zaludnienie w roku 1528 / H. Łowmiański. – Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 1998. – 227 s.

16. Wapowski, B. Kroniki Bernarda Wapowskiego z Radochoniec kantora katedr. krakowskiego. Cześć ostatnia czasy podługoszowskie obejmująnca (1480–1535)/ B. Wapowski// Scriptores rerum Polonikarum. – Kraków: druk. uniw. Jagiel., 1874. – T. II: Continet: Chronikorum Bernardi Vapovii partem posteriorem 1480–1535. – S. 1–256.

Библиотека БГУИР